Беларусь.info

№91 11/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Ананімы зноў кажуць пра хваробу лукашэнкі,  КДБ называе іх ліст правакацыяй.** Правакацыяй называюць распаўсюджаны напярэдадні ў некаторых СМІ ананімны ліст пра стан здароўя Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба і КДБ. Невядомыя, якімі прадставіліся «патрыётамі Беларусі» і «супрацоўнікамі дзяржбяспекі», паведамілі пра чарговы інсульт Лукашэнкі і барацьбу кланавых груповак у вышэйшых эшалонах улады. Паводле аўтараў ліста, першы інсульт з ім здарыўся яшчэ ў ноч з 19 на 20 сакавіка, другі — не так даўно, пасля няўдалых перамоваў з «Газпрамам». Начальнік Цэнтру інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі Валеры Надтачаеў назваў ананімны ліст сродкам інфармацыйнай вайны, якая вядзецца супраць існуючага рэжыму.

**Супраць кіраўніка ант рыгора кісяля распачатая крымінальная справа.** Нагадаем, напрыканцы мінулага тыдня адбылося «маскі-шоў» у мінскім офісе кампаніі «Тэлефільм», партнера АНТ. Супрацоўнікі пракуратуры арыштавалі ў яе ўсё абсталяванне, але ніхто з кіраўніцтва кампаніі затрыманы не быў. Адразу пасля гэтага стала вядома пра распачатую крымінальную справу супраць Рыгора Кісяля. Аднак ні дакладная фармулёўка, ні артыкул дагэтуль пракуратурай не агучаныя.

**Сваякі пацярпелых ад палітычных рэпрэсій у Беларусі перадалі ў пасольствы краін "Вялікай васьмёркі" адкрыты ліст кіраўнікам дзяржаў.** Махавік рэпрэсій у нашай краіне набірае абароты,- гаворыцца ў пасланні. Падчас прэзідэнцкіх выбараў больш за 1.200 чалавек, якія бралі ўдзел у іх на баку апазіцыйных кандыдатаў або выйшлі на вуліцы ў знак пратэсту супраць фальсіфікацый іх вынікаў, апынуліся ў турмах, звольнены з працы, выключаны з універсітэтаў. Аўтары адкрытага ліста заклікаюць кіраўнікоў дзяржаў пераканаць прэзідэнта Расіі адмовіцца ад усебаковай падтрымкі Аляксандра Лукашэнкі

**Да галадоўкі прадпрымальнікаў у Берасьці далучыліся яшчэ 3 чалавекі**. У Берасьцейскі аблвыканкам сёньня трапілі заявы ад Эдуарда Багдасарана, Тацьцяны Бялко і Вадзіма Авечкіна. У сваіх заявах яны паведамляюць, што далучаюцца да акцыі пратэсту прадпрымальнікаў і адмаўляюцца прымаць ежу. Эдуард Багдасаран працуе кіроўцам таксі на мікрааўтобусе, які належыць прадпрымальніцы Любові Разановіч.

**Гарадзенскага актывіста АГП трымаюць у псыхіятрычным шпіталі.** Ад пятніцыу псыхіятрычным шпіталі Горадні ўтрымліваецца сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі — 26-гадовы Павал Язерскі. Яго завезьлі ў шпіталь зь Ленінскага аддзяленьня міліцыі пасьля таго, як затрымалі за ўдзел у акцыі да чарговай гадавіны зьнікненьня Зьмітра Завадзкага.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org